УДК 378.091.2.017:811.161.3

В. А. Кузьміч, заг. кафедры (БДТУ)

# З ВОПЫТУ СУПРАЦОЎНІЦТВА КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ З КАФЕДРАМІ ТЭХНІЧНАГА ПРОФІЛЮ ПА ПЫТАННЯХ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Ідэалагічнае і патрыятычнае выхаванне ў тэхнічнай ВНУ ставіць перад кафедрамі гуманітарнага профілю задачу распрацоўкі эфектыўных формаў выхаваўчай працы і яе каардынацыі на агульнаўніверсітэцкім узроўні. У дадзеным артыкуле аналізуецца вопыт супрацоўніцтва ў гэтай галіне кафедры беларускай мовы БДТУ з кафедрамі тэхнічнага профілю. Паказаны асноўныя падыходы да выхаваўчай працы, іх практычнае ўвасабленне, а таксама эфектыўнасць такога цеснага супрацоўніцтва падраздзяленняў універсітэта.

Ideological and patriotic education at technical university set humanistic departments special goals to develop effective forms of educative work and to coordinate it at common university level. Experience of cooperation in this field between Belarusian language and technical sciences department is analyzed in this article. Main approaches to educative work, its practical implementations and effectiveness of such a close cooperation of university structures is shown here.

**Уводзіны.** У 2009/2010 навучальным годзе ў вышэйшых навучальных установах прыярытэтнымі напрамкамі ідэалагічнай і выхаваўчай працы застаецца фарміраванне ў студэнцкай моладзі грамадзянскасці і патрыятызму на аснове дзяржаўнай ідэалогіі. Гэта агульная задача павінна вырашацца шляхам узаемадзеяння і супрацоўніцтва ўсіх кафедраў універсітэта і выконвацца зыходзячы з дзяржаўных дакументаў па пытаннях ідэалагічнай і выхаваўчай працы. Асноўнымі з іх з’яўляюцца Канцэпцыя і Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. Менавіта ў гэтых дакументах сфармуляваны мэты і задачы, замацаваны прыярытэты выхавання, у тым ліку такія, як грамадзянскасць і патрыятызм.

**Асноўная частка.** Правільныя падыходы да арганізацыі патрыятычнага выхавання залежаць найперш ад планавання ідэалагічнай і выхаваўчай працы кафедры. Кафедра беларускай мовы як адна з гуманітарных навук прадугледжвае ў плане выхаваўчай працы супрацоўніцтва з іншымі кафедрамі тэхнічнага профілю. З гэтай мэтай загадчыкам кафедры выдадзены метадычныя рэкамендацыі па рэалізацыі ідэй Канцэпцыі і Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі (2004 г.). У друку знаходзіцца артыкул па планаванні ідэалагічнай і выхаваўчай працы (2009 г.) і рыхтуюцца да друку метадычныя рэкамендацыі для куратараў і выкладчыкаў «Планаванне ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў ВНУ» (аўтары В. А Кузьміч, Т. У. Жукоўская, 2010 г.). У дадзены дапаможнік будуць уключаны рэкамендацыі па планаванні выхаваўчай працы для кафедраў тэхнічнага профілю (тэматыка мерапрыемстваў: гутаркі, дыспуты, праекты, конкурсы і інш.).

Ідэалагічныя мэты, якія ставяцца перад вышэйшай адукацыяй у ВНУ, патрабуюць асаблівай увагі да развіцця каштоўнасна-сэнсавых кампетэнцый. Дадзеныя кампетэнцыі якраз і фарміруюць каштоўнасныя арыентацыі (патрыятызм, павагу да гістарычных традыцый і інш.). Таму асноўная сфера супрацоўніцтва з іншымі кафедрамі ажыццяўляецца праз прыцягненне студэнтаў розных факультэтаў да сумеснай навуковай і творчай дзейнасці. З гэтай мэтай створана студэнцкае творчае аб’яднанне «Пошук», у склад якога ўваходзяць гурткі глыбока патрыятычнага гучання («Памяць», «Пазнай свой край», «Мая Радзіма – Беларусь», «Спадчына», «Патрыёт» і інш.). Асноўная задача аб’яднання – выяўленне таленавітай моладзі і развіццё іх творчых здольнасцей. Як вынік, гэта падрыхтоўка навуковых і творчых прац на рэспубліканскія і міжнародныя конкурсы, распрацоўка праектаў і даследаванняў (напрыклад, «Сям’і маёй пачатак», «Камсамол у асобах і справах», «Вялікая Айчынная вайна вачыма маладых», «Беларусь – краіна маёй будучыні» і інш.). За апошнія 5 гадоў студэнцкім аб’яднаннем падрыхтавана для ўдзелу ў навуковых і творчых конкурсах **149** работ. З іх **77** адзначаны катэгорыямі, дыпломамі, граматамі, спецыяльнымі прызамі, падзякамі і каштоўнымі падарункамі. Па факультэтах:

**ВСіП** – бралі ўдзел **104** студэнты, пераможцаў – **48**;

**ТАР** – **16** студэнтаў, пераможцаў – **15**;

**ІЭ** – **7** студэнтаў, пераможцаў – **5**;

**ЛГ** – **5** студэнтаў, пераможцаў – **3**;

**ТТЛП** – **10** студэнтаў, пераможцаў – **4**;

**ХТіТ** – **7** студэнтаў, пераможцаў – **2**.

Праведзены **32 студэнцкія канферэнцыі глыбока ідэалагічнага зместу**, у якіх бралі ўдзел студэнты розных факультэтаў («Патрыёты Бацькаўшчыны», «Беларусь – мая Радзіма», «Мой край – мае карані», «Наш самы высокі набытак – Айчына, Навука, Сумленне», «Ніхто не забыты, нішто не забыта», «Квітней, край родны, край прыгожы», «Скарбы спадчыны

духоўнай», «Назвы роднай зямлі», «Твой гонар, Бацькаўшчына», «Янка Купала – вялікі нацыянальны паэт» і інш.).

Дзякуючы працы студэнцкага аб'яднання, да кожнай знамянальнай даты краіны і ўніверсітэта праведзены **15 універсітэцкіх выстаў** («БДТУ за квітнеючую Беларусь», «Мой край – мае карані», «Не разлюбі Айчыну, і жанчыну, і род свой, і народ не разлюбі», «Твой гонар, Бацькаўшчына», «Вайна вачыма маладых», «Мова, народ, гісторыя», «Пакінем спадчыну мы для нашчадкаў», «Халакост: памяць і перасцярога», «Гісторыя маёй сям'і – адна са старонак шматвяковай гісторыі краіны», «Да Беларусі з любоўю», «Зямля і маці – сімвал вечны» и др.); **4 акцыі** («Вясенні тыдзень дабра – 2007»; «Тыдзень Маці», культурна-экалагічная акцыя «Мой родны кут») з прыцягненнем да агульных акцый студэнтаў усіх факультэтаў. У сумесным праекце да 75-годдзя ўніверсітэта ўдзельнічалі студэнты, выкладчыкі і кіраўніцтва ўсіх факультэтаў. Распрацаваны ілюстрацыйныя матэрыялы, якія адлюстроўваюць гісторыю факультэта, яго навуковыя дасягненні, уклад у стваральную працу ўсёй краіны. Асобна вылучылі лепшых прадстаўнікоў факультэтаў, адзначылі іх персанальны ўклад у навуку і выхаваўчую дзейнасць. Да 90-годдзя Камсамола распрацаваны праект «Камсамол у асобах і справах» пра навукоўцаў БДТУ, актыўных камсамольцаў на пэўным гістарычным этапе развіцця краіны. Афармлены ілюстрацыйны матэрыял пра лепшых прадстаўнікоў факультэтаў. Плануецца новая канцэпцыя падачы матэрыялаў да 80-годдзя БДТУ.

Аналагічныя **праекты** з удзелам прадстаўнікоў факультэтаў і студэнцкай моладзі падрыхтаваны да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, да Года маці і Года роднай зямлі, якія знайшлі далейшае прымяненне на выставах рознага ўзроўню. На базе такіх тэматычных выстаў (4–5 дзён) праводзяцца куратарскія гадзіны для ўсіх факультэтаў, тэматычныя экскурсіі, ажыццяўляецца рэкламная дзейнасць прафарыентацыйнага характару.

Удзел у правядзенні XII Рэспубліканскай выставы па тэме «Сацыяльна-педагагічнае і псіхалагічнае суправаджэнне станаўлення асобы навучэнцаў і іх прафесійнае самавызначэнне» з'яўляецца пацвярджэннем неабходнасці сумесных дзеянняў кафедраў універсітэта дзеля выканання агульных задач. Загадчыкам кафедры беларускай мовы В. А. Кузьміч была прапанавана канцэпцыя выставы, прарэктарам па выхаваўчай працы А. Р. Гараноўскім праведзена нарада з удзелам намеснікаў дэканаў па выхаваўчай працы ўсіх факультэтаў. Былі размеркаваны абавязкі і тэрміны іх выканання. Як станоўчае, варта адзначыць бездакорнае выкананне ўсіх патрабаванняў. Прадстаўлены рэкламныя матэрыялы, праекты, конкурсныя навуковыя і творчыя працы, персанальныя міні-выставы, распрацоўкі па правядзенні майстар-класа і «круглых сталоў».

Дэманстравалася праца гурткоў «Пераплётчык» (кіраўнік І. В. Марчанка) і «Мастацкая кераміка» (кіраўнікі І. А. Лявіцкі, Я. М. Дзятлава). Падрыхтаваны электронныя прэзентацыі «Молодежь против ВИЧ/СПИДа» (В. В. Гудзінская, магістрант), «История Беларуси в изобразительных средствах и структурно-логических схемах» (У. Я. Казлякоў, прафесар кафедры гісторыі Беларусі), адбылася прэзентацыя відэафільмаў кафедры замежных моў (кіраўнік А. М. Раманава) і інш. Прадстаўлены рэкламныя матэрыялы па спецыяльнасцях і спецыялізацыях, па якіх праводзіцца навучанне ва ўніверсітэце.

Была агульная зацікаўленасць у выніках працы, і яна была рэзультатыўнай.

2005 г. – **Дыплом I ступені** за патрыятычнае выхаванне студэнтаў з выкарыстаннем матэрыялаў аб ратным і працоўным подзвігу беларусаў, прысвечаных 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне;

2005 г. – **Дыпломам I ступені** за сістэмны падыход да распрацоўкі ідэалагічнага суправаджэння выхаваўчага працэсу.

2006 г. – **Дыплом I ступені** Міністэрства адукацыі за фарміраванне здаровага ладу жыцця студэнтаў.

2007 г. – **Дыплом I ступені** Міністэрства адукацыі за выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму ў дзяцей і навучэнскай моладзі.

2008 г. – **Дыплом II ступені** Міністэрства адукацыі за маральна-прававое і сямейнае выхаванне дзяцей і навучэнскай моладзі.

На **Рэспубліканскі агляд-конкурс** праектаў на лепшую арганізацыю ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў вышэйшай навучальнай установе кафедра беларускай мовы прадставіла **3 праекты** («Сям'і маёй пачатак» (Т. У. Жукоўская); «Літаратурны клуб "Ветліца"» (Н. Я. Савіцкая); «Халакост: памяць і перасцярога» (В. А. Кузьміч).

Па выніках конкурсу атрыманы **2 дыпломы** Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (В. А. Кузьміч, Н. Я. Савіцкая), **Дыплом II ступені** Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і спецыяльны прыз ад рэдакцыі часопіса «Роднае слова» (Т. У. Жукоўская).

2009 г. – **Дыплом II ступені** Міністэрства адукацыі за сацыяльна-педагагічнае і псіхалагічнае суправаджэнне станаўлення асобы навучэнцаў і іх прафесійнае самавызначэнне.

Пашырана такая форма супрацоўніцтва з кафедрамі тэхнічнага профілю, як **сустрэчы**

**выдатных асоб** нашага ўніверсітэта са студэнцкай моладдзю падчас правядзення бінарных лекцый, практычных заняткаў, куратарскіх гадзін. Такія сустрэчы адбыліся з вучонымі БДТУ І. А. Лявіцкім, Л. М. Ражковым, П. М. Бураком, А. В. Пятровічам і інш. Запланавана правядзенне «круглага стала» па тэме «Экалагічныя веды ў традыцыйнай культуры беларусаў» сумесна з кафедрай філасофіі.

Цеснае супрацоўніцтва з кафедрамі тэхнічнага профілю ажыццяўляецца шляхам акультурацыі студэнцкай моладзі розных факультэтаў праз сістэмнае **наведванне музея БДТУ**. Кафедрай беларускай мовы забяспечана экскурсійнае абслугоўванне ў музеі (падрыхтавана лектарская група з мэтай экскурсійнага суправаджэння на беларускай і рускай мовах). Практычна ўсе студэнты І курса ўсіх спецыяльнасцей наведалі музей БДТУ, што з'яўляецца праяўленнем патрыятызму да месца навучання. Наведванне гарадскіх музеяў гісторыі і культуры, мастацкага і экалагічнага – абавязковая праграма для студэнтаў усіх факультэтаў. **Музейныя заняткі** – адзін з метадычных прыёмаў, які актыўна выкарыстоўваецца выкладчыкамі кафедры. Далучэннем да так званага «высокага мастацтва» ахоплены практычна ўсе курсы, дзе працуюць выкладчыкі кафедры беларускай мовы. Наведванне выстаў, тэатраў, кіно – неабходнасць сённяшняга дня.

У рэчышчы рэспубліканскай акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» кожны год наладжваюцца **экскурсіі па родным краі**, да правядзення якіх прыцягваюцца прадстаўнікі іншых факультэтаў. За апошнія 5 гадоў наладжана звыш **30** экскурсій: «Мінск – Гродна», падарожжа па літаратурных мясцінах народнага паэта Беларусі Якуба Коласа «Мой родны кут», «Мінск – Вязынка», «Мінск – Пінск – Моталь», «Мінск – Полацк», «Мінск – Хатынь – Курган Славы», «Мінск – Нясвіж – Мір», «Мінск – Глыбокае – Мосар», «Мінск – Ракаў – Івянец – Дзяржынава» і інш. Для лепшых студэнтаў універсітэта і замежных студэнтаў праведзена экскурсія на малую радзіму Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Мінск – Шклоў – Александрыя», да правядзення якой былі далучаны прадстаўнікі іншых кафедраў (В. М. Фарафонтаў, дэкан факультэта ТАР; М. Т. Наскавец, загадчык кафедры транспарту лесу; І. В. Сакалоўскі, дацэнт кафедры глебазнаўства; Н. В. Чорная, Ж. У. Бандарэнка, Ю. У. Пагарэлава, факультэт ТАР; Л. В. Навасельская, кафедра машын і апаратаў і інш. (гурт «Акавіта»)). Падрыхтавана вялікая канцэртная праграма і прафарыентацыйная гадзіна для вучняў старэйшых класаў. Па выніках экскурсій падрыхтаваны прэзентацыі, ілюстрацыйныя матэрыялы, якія папоўняць базу прыкладнога матэрыялу для выкарыстання на занятках па новых для кафедры дысцыплінах «Краіназнаўства і краязнаўства», «Этнаграфічныя аб'екты турызму», «Экскурсазнаўства».

Выкарыстанне творчага патэнцыялу студэнцтва ў ідэалагічнай і выхаваўчай працы кафедры і ўніверсітэта знаходзіць сваё адлюстраванне ў працы **літаратурнага клуба «Ветліца»** (кіраўнік Н. Я. Савіцкая). Выдадзены 5 зборнікаў літаратурных твораў «AVE», у якіх прадстаўлены літаратурныя набыткі не толькі студэнтаў, але і выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

На кафедры створаны **міні-валанцёрскія групы** з мэтай патрыятычнага выхавання студэнтаў іншых факультэтаў. Распрацаваны шэраг тэматычных куратарскіх гадзін, аб'яднаных агульнай назвай «Гістарычная памяць – аснова патрыятызму». Для правядзення такіх гадзін прыцягнуты студэнты-пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, удзельнікі літаратурнага клуба «Ветліца» і гурткоў студэнцкага аб'яднання «Пошук». Па заяўках куратараў студэнцкіх груп такія мерапрыемствы ўжо праведзены куратарамі Т. П. Вадап'янавай, Я. М. Дзятлавай і інш. Плануецца распрацоўка шырокага спектра выхаваўчых мерапрыемстваў (тэматычных куратарскіх гадзін, літаратурных чытанняў, дыспутаў, «круглых сталоў», сустрэч са знакамітымі навукоўцамі, вучонымі, прадстаўнікамі органаў правапарадку і інш.), якія кафедра беларускай мовы можа прапанаваць іншым кафедрам для правядзення ідэалагічнай і выхаваўчай працы. Ствараецца банк даных, тэматыка якога будзе даведзена да кіраўніцтва факультэтаў.

**Заключэнне.** Эфектыўнасць арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў вышэйшых навучальных установах залежыць перш за ўсё ад узроўню прафесіянальна-педагагічнай дзейнасці выкладчыкаў, куратараў студэнцкіх груп, іх умення актыўна ўздзейнічаць на фарміраванне ў студэнцкай моладзі пэўнай сістэмы поглядаў, перакананняў, нормаў паводзін, якія вызначаюцца ідэалогіяй беларускай дзяржавы. Толькі сумеснымі намаганнямі ўсіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу можна дасягнуць станоўчых вынікаў у выхаванні.

*Паступіў 02.04.2010*